Цана асобнага нумару 500.000 м.

Сын Беларуса

322 WILNO, ul. Uniwerstytecka 9—9. T. Wróblewski. ... я вул. ... ад 12 да 2 г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад 9 да 3 г.

Выходзіць тры разы у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3.600000 м.
Для заграніцы удвая даражэй.

Няпрынятыя у друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.
Цана абвестак: перад тэкстам 400.000 мк., сярод тэксту 300.000 м. і на 4 стр. 250.000 м., за радок пэтыту у 1 шп.

№ 5. Вільня, Пятніца, 13-га чэрвеня 1924 г. Год I.

Няудалая спроба.

Зусім зразумелым і — у нармальных абставінах—зусім слушным зьяўляецца імкненьне да ўзаемнага збліжэньня народаў, якім даводзіцца з тае ці іншае прычыны жыць пад аднэй дзяржаўнай страхой. Такое імкненьне выяўлялі заўсёды паняволеныя народы царскае Расеі. Такое-ж імкненьне выявіла нядаўна група беларускіх і польскіх грамадзкіх дзеячоў, якая заснавала ў Вільні Польска-Беларускае Таварыства.

Але тое, што натуральна ў *нармальных* абставінах, зусім немагчыма і нерэальна ў тых абставінах, якія стварыла для беларускага насяленьня польская дзяржава. І нарадзіны Польска-Беларускага Т-ва пры сучасных беларуска-польскіх адносінах зразу-ж выклікалі варожыя адносіны да гэтае спробы як з боку уціскаых беларускіх масаў, так і з боку панующага пад намі польскага грамадзянства.

Хто памятае, як польская старана груба сарвала спробу беларуска-польскага супрацоўніцтва на грунце чыста навуковых досьледаў (справа „celi Konrada“, калі вынікі гэтых досьледаў паказалі ўсім бязглуздае злоўжываньне навукі дзеля брудных палітычных мэтаў польскага нацыяналізму,—той ня мог верыць у разьвіцьцё Польска-Беларускага Таварыства нават у самых вузкіх рамках дзейнасьці. І вось яно завяла, не пасьпеўшы расьцьвісьці, не здалеўшы нават афіцыяльна адкрыцца....

Гэта—важны паказчык таго, да якога абастрэньня дайшлі ўжо беларуска-польскія адносіны. І адносіны гэтыя, ня гледзячы на бутафорскія нарады аб „санацыі“ справы „нацыянальных меншасьцяў“ Польшчы, з кожным днём абастраюцца ўсё больш і больш, а „гаспадары палажэньня“, якія так урачыста заклікаюцца перад французскімі „прыяцелямі“, што „белага тэрору“ ў Польшчы няма, — адначасна прыдумываюць і пускаюць у ход новыя мэтады барацьбы, уціску і зьдзеку над „меншасьцямі“.

З зьменшчаных у гэтым нумары інтэрпэляцыяў нашых паслоў відаць, што ня толькі беларусы, па стараму, пазбаўляюцца грамадзкіх правоў у Польшчы, забясьпечаных Міравымі Трактатамі (гл. інтэрпэляцыю ў справе Гаўрылы Косьцевіча), ня толькі ўрадоўцы, якія ўжо *фармальна* аддадзены пад суд за катаваньне насяленьня, дастаюць вышэйшыя становішчы (гл. інтэрпэляцыю ў справе Кухэйды), ня толькі палітычным вязьням без дай прычыны ўзьдзяваюць кайданы (гл. інтэрпэляцыю ў справе пасла Барана), — але *на барацьбу з беларускім насяленьнем і яго выбранцамі—пасламі выпускаюцца арганізаваныя банды аружных вайсковых асаднікаў*, якія—з ведама і з участцем паліцыі — робяць напады на пасольскія вечы, пагражаючы „недатыкальным“ паслом-беларусам (гл. інтэрпэляцыю ў справе нападу паліцыі і асаднікаў у Пружане).

Апошні факт тым больш красамоўны, што ён не адзінокі: такі-ж факт гвалтоўнага разгону беларускага пасольскага веча, як чытаем у другой інтэрпэляцыі нашага Пасольскага Клюбу, меў месца 8 мая г. г. у Даўгінаве, і мясцовая ўлада тлумачылася, што Вялейскаму Старосьце даў адпаведны загад п. Дэлегат Ураду ў Вільні.

Чыннае выступленьне вайсковых асаднікаў на барацьбу з беларускім насяленьнем раскрывае ўрэшце ўсе закулісныя камбінацыі аўтараў закона аб вайсковым асадніцтве: цяпер ясна кожнаму, з якімі мэтамі сялілі сярод нас сотні і тысячы асаднікаў. І мы павінны цяпер прыпомніць, што гэтую варожую нашаму народу сілу стварыла ўся польская большасьць Сойму, не выключаючы ні правых, ні левых!

Ясна, што не пара цяпер шукаць „паразуменьня“ нават з найбольш дэмакратычнымі польскімі групамі — хоць-бы толькі на грунце культурнага збліжэньня. Яшчэ не супакоіўся ў Польшчы шал дзікога нацыяналізму, што агарнуў блізу ўсё польскае грамадзянства. Яшчэ нацыяналістычная рэакцыя ня йдзе на убыль, а, наадварот, ўсё крапчэе. І ў такі мамэнт усе спробы збліжэньня беларускага і польскага грамадзянства зьяўляюцца бясплоднымі і наперад засуджанымі на няўдачу: *ня можа быць збратаньня між рабом і яго прыгнятым*!

Афіцыяльныя цыфры.

Аб тым, як польская адміністрацыя зьдзекуецца над насяленьнем, красамоўна гавораць гэткія афіцыяльныя цыфры, дадзеныя рэдакцыі газэты „Kurjer Polski“ ў міністэрстве ўнутраных спраў.

Сярод караў, наложаных на „постэрунковых“, „ст. постэрунковых“, „пшодовнікаў“ і „ст. пшодовнікаў“ у 1923 годзе за розныя правіннасьці, *другое месца па сваей лічбе займаюць кары за біцьцё*. Сярод кар за біцьцё—*75%* *прадстаўляюць кары за біцьцё ў часе* „*badania*“ (*дапросу*) *арыштаваных*.

У суд пакіраваны 542 справы паліцэйскіх агентаў сказанае ступені, спаміж якіх 40%—гэта справы аб біцьцё.

Пададзеныя кары абыймаюць і кары, накладаныя на агентаў *палітычнае паліцыі*.

А сколькі такіх праступкаў асталося бяз ніякае кары, гэтага і падлічыць нельга!....

Папярэднік французскага пратэсту.

У органе „Паразуменьня Лявіцы“ L' Ere Nouvelle („Новая Эра“) ад 5/V зьмешчаны ў аддзеле „Вольныя Думкі“ тры артыкулы вядомай парыжскай публіцысткі Severine (запраўднае прозьвішча ее—M-me Gebhart,) пад характэрным для нашых „часоў і народаў“ агульным загалоўкам „Трыумф ненавісьці“...

Першы „абразок“ гэтага „трыптыху“ і другі датычаць гэтага „трыумфу“ ў Францыі; апошні пасьвячоны Польшчы.

У першым, пад назовам „Без зьмілаваньня“, аўтарка прыводзе, як прыклад гэтага „трыумфу“ ваеннай варварызацыі з даўнейшай гісторыі Францыі, факт, калі легат (паўнамоцнік) Рымскага Папы, кіраваўшы асадай места Бэзье, на запытаньне, як сартаваць палонных, пабожна адказаў:“ — „*Забіваць усіх падрад,—Бог сам пазнае і сам адбярэ сваіх*“.

„Ці нашая слаўная цывілізацыя зьмяніла штось у гэтым усім?—пытаецца аўтарка. — „Ня вельмі многа“,—адказываець сама сабе. І ў пацьверджаньне прыводзе сучасную Францыю і сучасную Польшчу, якія гэтак хваляцца сваей „цывілізацыяй“...

І вось у гэткай агульнай рамцы пані Сэвэрын ахвяруе Польшчы такі лірычны артыкулік пад назовам „Іншыя сумы“.

„Да мяне доходзе з Польшчы востра балючы закід...—Рэч ідзе аб штодзенных катаваньнях сотняў вязьняў у Польшчы...

Гэтая, так каханая намі, Польшча, — такая пекная пад царскім ярмом!—такая шляхотная, калі была закавана ў патройныя кайданы, Польшча, на абарону якой Францыя ахвяравала столькі сваіх пакаленьняў, — і вось, даволі было ёй, гэтай шляхотнай у няволі Польшчы, дапяць свайго вызваленьня, каб з ахвяры абярнуцца ў ката... Ды гэта-ж—немагчыма!..

Аднак гэта так... — Ня Польшча, толькі яе ўрад.

Гэткі заўсёды лёс тых дзяржаў, якіх мы самі апранулі ў жаўнерскія шапкі і аздаблялі шабляй, якіх мы назначалі „жандарамі Эўропы“.!.

Заўсёды абшытая галуном (ваенная) шапка зьмяняе ўклад думкі таго мозгу, які яна прыкрывае...

І вось, у рэзультаце—больш як паўтары тысячы палітычных вязьняў гніюць у агідных, заражоных вастрогах, без сьвятла, без паветра, заяданыя вошамі, замораныя голадам, біцьцём, *катаваньнем*. Паміж імі—жанчыны, з якіх адна, Ольга Бэсарабава, памерла.

Да гэтага я яшчэ вярнуся. Але і цяпер ужо я хачу пратэставаць проці гэтага, як гэта робяць там, на мейсцы, паслы Крулікоўскі і Ланцуцкі.

Дзе-б ні чынілася гэтая агіда, хто-б ні былі катамі і ахвярамі, калі толькі гэта робіцца запраўды, а ня выдумана ў мэтах „прапаганды“,— усё гэта можа толькі напоўніць сэрца абурэньнем“.

Так шляхотная французская публіцыстка ўжо ў пачатку красавіка, задоўга да рэшты падпісаўшых вядомы пратэст, адазвалася на тое, што дзеецца ў „шляхотнай пад трайной няволяй“ Польшчы...

Пастанова прэзідыуму Беларускага Нацыянальнага Камітэту у Вільні.

Пазнаёміўшыся ў паседжаньні сваім 26. V. 24 г. з пратэстам французскіх грамадзкіх дзеячоў проці белага тэрору ў Польшчы, а такжа выслухаўшы інфармацыі аб выступленьнях самазванных прадстаўнікоў беларускіх работнікаў перад урадамі Францыі, Англіі і Амэрыкі проці гэтага пратэсту, — прэзідыум Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, які злучае ў сабе прадстаўнікоў усіх беларускіх партыяў і арганізацыяў, сьцьвярджае, што асобы, якія прыймалі учасьце ў далегацыі да п. Пуанкарэ, а такжа англійскага і амэрыканскага паслоў у Парыжы ад імя беларускіх работнікаў, дэмэнтуючы факты, паказаныя ў памянёным пратэсьце, зьяўляюцца самазванцамі, нічога супольнага з беларускімі работнікамі і беларускімі работніцкімі арганізацыямі ня маюць і высказываюць выключна свае асабістыя пагляды, рэзка супярэчныя з запраўдным палажэньнем беларусаў у Польскай Рэспубліцы.

Прэзідыум Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні горача пратэстуе проці містыфікатараў і іх інспіратараў, якія хочуць аслабіць уражаньне высока гуманітарнага выступленьня французскіх дзеячоў у абарону уціснанага беларускага насяленьня ў Польшчы.

Просімо ўсіх нашых паважаных грамадзян падпішчыкаў, якія неакуратна атрымліваюць газэту, рабіць спачатку справкі на мясцовай пошці, а тады з гатовымі ад яе адказамі зварачвацца да нас.

Адміністрацыя.

Інтэрпэляцыі Беларускага Пасольскага Клюбу.

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ

пасла Ярэміча і тав. з Беларускага Клюбу да пана міністра ўнутраных спраў у справе *аружнага разгону паліцыяй справаздаўчага веча* ў м. Пружане і *аб бандыцкіх нападах вайсковых асаднікаў* на памянёнае веча.

6 мая г. г. ў м. Картуз-Бяроза Пружанскага пав. адбылося пасольскае справаздаўчае веча, на якім мясцовае жыхарства было апавешчана, што 25 мая г. г. ў м. Пружане мае адбыцца справаздаўчы зьезд для Пружанскага павету, аб чым такжа павядомлена Старосства.

Ужо раніцай 25 мая можна было бачыць гуляўшыя групы вайсковых асаднікаў, якія прыбылі ў Пружану, каб сарваць веча.

Прадстаўнікі мяйсцовага насяленьня Пружанскага пав., жадаючы быць на справаздаўчым вечы сваіх паслоў, зьявіліся даволі людна, бо ў лічбе звыш 2.000 дэлегатаў ад паадзінокіх вёсак прыбыла на зьезд. З увагі на такую лічбу дэлегатаў і труднасьці знайсьці адпаведнае памяшчэньне (паліцыя звычайна чапляецца да ўласьнікаў памяшчэньняў, дзе адбываюцца вечы беларускіх паслоў), зьезд быў адчынены пад адкрытым небам. Адчыняючы зьезд, я заявіў, што асаднікі, сабраныя ў Пружану ў вялікшай лічбе, маняцца сарваць гэтае веча. І запраўды ў часе першае прамовы пасла Валошына група асаднікаў пачала сьвістаць, пхацца праз народ да трыбуны,— але дэлегаты, стоючы мурам, не дапускалі авантурнікаў да мэты. Тады асаднікі, пабіўшыся на паасобныя баёўкі па 10—15 душ кожная, пад каманай старшых па чыну, у якіх былі чырвона-белыя перавязкі і какарды, распачалі арганізаваны напад на ўчасьнікаў веча.

Пачалі біць народ каменьнямі, кіямі і ручкамі ад рэвальвэраў. Калі беларуская люднасьць, на якую гэтак напалі, зьбіралася ўціхамірыць няпрошных гасьцей—вайскавых асаднікаў, зьявілася конная паліцыя, якая, замест абязброіць асаднікаў, нарушаючых супакой, пачала атакаваць безбаронны народ, — разганяць учасьнікаў зьезду, б'ючы кольбамі па галовах, тварах і гдзе папала. У рэзультаце зьезд разагналі і арыштавалі некалькі асоб—учасьнікаў зьезду, між імі—ніводнага асадніка.

Пасьля разгону зьезду паліцыяй і арганізаванымі асаднікамі я зьвярнуўся да старосты. П. староста Гэль заявіў мне, што было ведама ўжо ў 9 гадз. раніцы аб нападзе асаднікаў, які меўся быць зроблены на справаздаўчы зьезд беларускіх паслоў. Аднак, п. староста не папярэдзіў мяне аб гэтым у 11 гадз. ў дзень зьезду, калі я гутарыў з старостай у справе веча, што мелася адбыцца.

Выявілася, што асаднікаў на 25 мая сьцягівалі ў Пружану з трох паветаў, а іменна: Пружанскага, Косаўскага і Дрогічынскага, і што п. староста добра ведаў аб мяркаваньнях вайсковых асаднікаў.

Значыць, адміністрацыйная ўлада, замест запэўніць супакой і бясьпечнасьць учасьнікам зьезду, была заадно з аружнымі бандамі вайсковых асаднікаў, дапамагаючы ім аканчальна зьліквідаваць зьезд. Гэтае здарэньне аканчальна пераканала ўсіх учасьнікаў зьезду і п. паслоў, што польская адміністрацыя на беларускіх землях ня хоча запэўніць публічнае бясьпечнасьці беларускай людпасьці, калі на апошнюю нападаюць польскія асаднікі, і, наадварот, органы публічнае бясьпечнасьці ідуць рука ў руку з напасьнікамі.

З прычыны вышэйсказанага ніжэйпадпісаныя пытаюцца ў п. Міністра: 1) ці маніцца спыніць у чыннасьцях п. старосту Гэля за ўчасьце ў аружным разгоне справаздаўчага веча? і 2) ці маніцца дапускаць арганізацыі вайсковых асаднікаў, што маюць на мэце рабіць напады на справаздаўчыя вечы беларускіх паслоў?

Варшава, 3 чэрвеня 1924 г.

ІНТЕРПЭЛЯЦЫЯ

пасла Ярэміча і тав. з Беларускага Клюбу да п. п. міністраў справядлівасьці і ўнутраных спраў—у справе *налажэньня кайданоў паслу Сяргею Барану.*

Ваенны суд у Горадні вызваў на дзень 10 мая пасла Сяргея Барана, як сьведку. Вядучы яго ў 10 гадз. раніцы, горадзенская паліцыя асьмелілася узьдзець яму кайданы, пры чым, як-бы дзеля зьдзеку, вяла яго сярэдзінай вуліцы.

Пасол С. Баран, сталы жыхар м. Горадні, якое зьяўлецца яго родным местам, вядомы ўсей тутэйшай людпасьці, як заслужоны грамадзкі дзеяч і праўдзівы абаронца беларускага народу ў Польшчы. Дзеля гэтага ён і быў выбраны за пасла ў сваім вокрузе.

Як ведама, пасол С. Баран у свой час самахоць зьявіўся на суд, што даводзіць што ён ня зьбіраўся ўкрывацца ад „вымеру справядлівасьці"; ён зьяўляецца палітычным вязьнем, а не крымінальным, дык закаваньне яго ў кайданы мы лічым за зьдзекаваньне паліцыі над беларускім паслом.

Факт гэты сьведчыць ня толькі аб наруганьні паліцыі над паслом Баранавым, але і аб непашанаваньні дзяржаўнай адміністрацыяй высокага і сьвятога ўчуцьця беларускага працоўнага народу ў Польшчы, якое ён мае да свайго выбранца. Гэты факт яшчэ больш паглыбіў істнуючую пропасьць паміж польскай адміністрацыяй і беларускім народам.

Дзеля вышэйсказанага ніжэй надпісаныя пытаюцца ў п. п. міністраў: 1) ці ведама ім аб вышэйшым факце? 2) ці вышэйшая ўлада выдала загад узьдзець паслу Барану кайданы? 3) ці маняцца яны пацягнуць да адказнасьці вінаватых у надужыцьці над беларускім паслом? 4) ці маняцца далей дапускаць накладаньне кайданоў палітычным вязьням?

Варшава, 10 чэрвеня 1924 г.

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ.

пасла Ярэміча і тав. з Беларускага Клюбу да пана старшыні Рады Міністраў у справе выдаленьня з горадзенскае паліцыі шподовніка Кухэйдо.

З прычыны наплыву скаргаў насяленьня горадзенскага павету на біцьцё і катаваньне людпасьці тамтэйшай паліцыяй „Соймавая Камісія дзеля разгляду надужыцьцяў адміністацыі на Ўсходніх Крэсах" 9-га траўня 1923 году паехала ў Горадню, каб праверыць пададзеныя факты. 10-га траўня камісія пад старшынствам пасла Тугута была ў Марцінканскай гміне Горадзенскага пав. Камэндантам пастарунку ў гэтай гміне быў нейкі Кухэйдо; у гэтым пастарунку былі забіты двое людзей нібы-то за ўцяканьне. Соймавая Камісія гэтае справы ня выясьніла, бо яна ўжо была пакіравана да пракурора. Затое Камісія выслухала да ста сьведкаў аб страшэнным і нялюдзкім катаваньні народу камэндантам пастарунку Кухэйдо. Усе сьцвердзілі, што Кухэйдо загадываў паліцэйскім катаваць людзей (біцьцё ў пяткі, нагайкамі і г. д.), а сам сядзеў і папіваў гарэлку пад музыку на „балалайцы". Камісія аднагалосна сьцвердзіла, што гэтак паступаць можа толькі хворы на разум, або садыст, і што для такіх людзей не павінна быць месца ў паліцыі. На запытаньне Камісіі ў Камэнданта паліцыі Горадзенскага пав., ці яму было ведама аб катаваньні людзей кам. Кухэйдо, павятовы камэндант заявіў, што такія факты яму вядомы і што ён з свайго боку пакіраваў гэту справу да пракурора і распачаў дысцыплінарную справу, а Кухэйдо адсунуў ад выпаўненьня чыннасьцей. Я асабіста быў пераканаены, што Кухэйдо атрымае заслужоную кару, але аказалася інакш.

Праз нейкі час я даведаўся, што Кухэйдо атрымаў вышэйшае службовае становішча, чым ён меў раней, бо яго назначылі камэндантам адрэзку пагранічнае варты ў Горадзенскім пав. Справа гэтая была паднята на засяданьні Адміністрацыйнае Камісіі ў пачатку сёлетняга году, на якім быў і камэндант дзяржаўнае паліцыі п. Божэнцкі, каторы адказаў старшыні Камісіі: „Пане старшыня! Камэнданта Кухэйдо ў паліцыі ня будзе!" Аднак, ані пастанова Соймавае Камісіі, ані абяцаньне пана камэнданта Божэнцкага нічога не памаглі. Кухэйдо да дня 17-га траўня г. г. найспакайней гуляе сабе ў паліцэйскім мундзіры, далей зьдзекуючыся над народам.

Дзеля вышэйшага інтэрпэлянты пытаюцца ў пана старшыні Рады Міністраў: 1) ці маніцца ён выдаліць з паліцыі Кухэйдо і аддаць яго судовай уладзе? 2) ці маніцца пацягнуць да адказнасьці камэндантаў паліцыі павятовай, ваяводзкай і камэнданта дзяржаўнае паліцыі п. Божэнцкага за дапусканьне праступных чыннасьцей Кухэйды?

Варшава, 6-га чэрвеня 1924 г.

Эндэкі падбураюць войска.

Эндэцкая газэта „Dziennik Wileński" ў № 128 з 7 чэрвеня 1924 г. ў перадавіцы пад загалоўкам „Miecz i waga" піша:

„Да вас прамаўляем, паны вайсковыя, якія істнуеце ня толькі дзеля параду трэцямайскага. Калі-ж ты, Польшча, пакажаш сваім замежным і ўнутраным ворагам свой моцарны кулак, калі скажаш: „Quos ego!"

Як відаць, „канстытуцыйных" спосабаў гнібеньня „ўнутраных ворагаў", проці якіх пратэстуе ўвесь культурны сьвет, польскім эндэкам яшчэ мала: яны падбураюць войска проці ўсіх тых, каго эндэкі лічаць „унутранымі ворагамі", —ведама, перад усім проці ненавісных „нацыянальных меншасьцяў"....

У тэй-жа стацьці тая-ж газэта вітае зьехаўшыхся ў Вільні польскіх юрыстаў, як прадстаўнікоў права. Ня шкодзіла-б у іх запытацца: *ці польскае права пазваляе падбураць войска проці спакойных грамадзян, абвешчаных эндэкамі за „ўнутраных ворагаў"*?

Ня шкодзіла-б запытацца і ў пана міністра Замойскага: каму з суседзяў Польшча пагражае сваім „зялезным кулаком"?

Артыкул VII.

Як ужо вядома нашым чытачом, Чычэрын 10 мая г. г. паслаў польскаму ўраду ноту з пратэстам проці нарушэньня Польшчай арт. VII польска-расейскага міравога трактату, падпісанага ў Рызе ў 1921 годзе. Нарушэньне гэтае радавы ўрад бачыць у фактах уціску Польшчай нацыянальных меншасьцяў—беларусаў, украінцаў, расейцаў, а такжа праваслаўнае царквы, ня гледзячы на тое, што міравы трактат забясьпечывае ім усе свабоды.

Польскі ўрад у гэтым выступленьні СССР у абарону беларусаў, украінцаў і расейцаў, якія жывуць пад польскаю ўладаю, убачыў жаданьне ўмяшацца ў унутраныя справы Польскае Рэспублікі і ўхіліўся ад абгавору паказаных у ноце Чычэрына фактаў нацыянальнага і рэлігійнага ўціску.

Чычэрын 23 мая г. г. выслаў новую ноту, у якой, паміж іншым, гавора:

„Урад СССР самым рашучым спосабам адкідае абвінавачываньне яго ў жаданьні мяшацца ў унутраныя справы Польскае Рэспублікі нотай з дня 10 мая г. г. № 769. Гэная нота абаперта была на неляяльным выпаўненьні польскім урадам артыкулу VII рыжскага трактату, які выразна кажа аб абавязку польскага ўраду надзяляць — на аснове раўнапраўнасьці нацыянальнасьцей—асобы расейскай, украінскай і беларускай нацыянальнасьцей у Польскай Рэспубліцы ўсемі правамі, забясьпечваючымі свабоднае разьвіцьцё культуры, мовы і выпаўненьня рэлігійных абрадаў. Памянёныя саюзным урадам у сказанай ноце з 10 мая г. г. факты нябывалага ўціісканьня мовы, школы і рэлігіі расейцаў, украінцаў і беларусаў, абапертыя на далёка ня ў поўнай меры выкарыстаным матэрыяле, які мае народны камісарыят заграгічных спраў, зусім не адкінуты нотай польскага ўраду, што зьяўляецца бязсумліўным доказам правільнасьці заяваў саюзнага ўраду.

„Заява польскага ўраду, што выступленьне ўраду Саюзу Сацыялістычных Радавых Рэспублік у абарону патаптаных правоў нацыянальных меншасьцей у Польшчы, якія забясьпечаны вышэйпамянёным артыкулам VII рыжскага трактату, зьяўляецца ўваходжаньнем у ўнутраныя справы Польскае Рэспублікі, — пярэчыць тэксту і духу артыкулу VII, які дае саюзнаму ўраду фармальнае права абароны правоў нацыянальных меншасьцей дарогай вымаганьня ад польскага ўраду точнага выпаўненьня яго".

Адказ, дадзены на ноту з 10 мая польскім урадам, Чычэрын разглядае, як *„доказ таго, што — на пагляд польскага ўраду— ня ўсе артыкулы рыжскага трактату павінны быць выпаўнены. Гэтакую апінію польскага ўраду саюзны ўрад прыймае да ведама"*.

На гэтую ноту польскі ўрад у ноце сваей з 27 мая г. г. адказаў, паміж іншым, гэтак:

„Польскі ўрад рашуча засьцерагаецца проці неўласьцівага тлумачэньня саюзным урадам заявы, зьмешчанай у ноце з дня 15 мая г. г. № Д. 2310, а такжа проці неўласьцівага тлумачэньня артыкулу VII рыжскага трактату, які забясьпечаньне свабод, узаемна прызнаных нацыянальным меншасьцям, стаўляе ў залежнасьць выключна ад унутраных законаў цанае дзяржавы.

На жаль, законы-законамі, але Чычэрын пратэстуе якраз ня проці іх, а проці іх *невыпаўняньня*. Як бачым, польскі ўрад нічога не гаворыць аб апошнім—і справу аб уціску нацыянальных і рэлігійных меншасьцяў пераносе на зусім іншы грунт—на грунт спрэчкі аб тое, як разумець артыкул VII рыжскага трактату. Дзеля гэтага даем тутака точны зьмест гэтага артыкулу,—тым балей, што гэты іменна артыкул можа стацца гістарычным... Вось ён:

Арт. VII. 1. Польшча дае асобам беларускай, расейскай і ўкраінскай нацыянальнасьці, якія знаходзяцца ў Польшчы, на аснове роўнапраўя нацыянальнасьцяў, усе правы, якія забясьпечаць вольнае разьвіцьцё культуры, мовы і выпаўненьня рэлігійных абрадаў. Узаемна Расея й Украіна забясьпечваюць асобам польскай нацыянальнасьці, якія знаходзяцца ў Беларусі, Расеі й Украіне, усе тыя самыя правы.

Асобы беларускае, расейскае й украінскае нацыянальнасьці ў Польшчы маюць права, у межах унутранага законадаўства, культываваць сваю родную мову, арганізоўваць і падтрымліваць свае школы, разьвіваць сваю культуру і закладаць дзеля гэтае мэты таварыствы й саюзы. Гэтымі самымі правамі, у межах унутранага законадаўства, будуць карыстацца асобы польскае нацыянальнасьці, якія знаходзяцца ў Беларусі, Расеі і Украіне.

2. Абедзьве дагаворныя староны ўзаемна абавязваюцца ні пасрэдна ні беспасрэдна не мяшацца ў справы, што датычаць устройства і жыцьця царквы (касьцёлу) і рэлігійных таварыстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі другее стараны.

3. Цэрквы (касьцёлы) і рэлігійныя таварыствы, да якіх належаць асобы польскае нацыянальнасьці ў Беларусі, Расеі і Ўкраіне, маюць права, ў межах унутранага законадаўства, самастойна ўстройваць сваё ўнутранае царкоўнае (касьцельнае) жыцьцё.

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ.

паслоў Беларускага Клюбу да пана старшыні Рады Міністраў у справе *непрызнаваньня ўрадам грамадзянскіх правоў беларуса*—грамадзян Польшчы, што знаходзяцца часова па за яе межамі.

На аснове Вэрсальскага Трактату (арт. 3 і 4) Польшча забавязалася прызнаць за сваіх грамадзян беларусаў, сталых жыхароў тэрыторыяў, якія ўваходзяць у склад Рэчыпаспалітай.

На жаль, гэны Трактат астаўся толькі падпісаным, а Польскі Ўрад зусім ня думае выпаўняць забавязаньні, якія выплываюць з Вэрсальскага Трактату.

Вось, Гаўрыла Косьцевіч, сталы жыхар (сялянін) вёскі Бабро̆уні, Скідэльскае гміны, Гарадзенскага пав., які часова знаходзіцца ў Югаславіі, 8-га жніўня 1922 г. зьвярнуўся ў консульства Польскае Рэспублікі ў Белградзе з просьбай даць яму візу на паварот да краю. Консуль ня мог прыхільна ўладзіць гэту справу, пазываючыся на інструкцыі з Варшавы. На выступленьне ў гэтай справе Беларускага Пасольскага Клюбу 11-га красавіка 1924 году Міністэрства Заграрічных Спраў прыслала 26. IV. 24 г. гэткі адказ:

„Міністэрства Заграрічных Спраў паведамляе, што справа ўезду ў Польшчу Гаўрылы Косьцевіча разьвязана адмоўна. Адначасна Міністэрства Заграрічных Спраў заяўляе, што пры вышэйшым паданьні няма штэмплёвае аплаты ў суме 3.800.000 мар. п., якую то суму пан Пасол будзе ласкавы пераслаць Міністэрству Заграрічных Спраў, пазываючыся на № гэтага пісьма".

Вышэйшы адказ Ураду выразна гаворыць аб няўважлівасьці яго да польскіх грамадзян беларусаў бо нават беларускім паслом ня рачыць даць вычэрпываючага тлумачэньня датычна забароны павароту беларусаў у свой край.

Дзеля гэтага, пазываючыся на Канстытуцыю П. Р., а так-жа на Соймавы Рэгулямін. дамагаемся адказу на ніжэйшыя запытаньні: 1) ці Урад будзе выпаўняць адпаведныя артыкулы Вэрсальскага Трактату і Міравога Трактату, падпісанага ў Рызе, у справе грамадзянства беларусаў? 2) ці Урад маніцца ўзяць назад забарону Гаўрыле Косьцевічу вярнуцца ў свой край?

Варшава, 20 траўня 1924 г.

Палітычныя падзеі.

Беларуска-украінская абструкцыя.

На паседжаньні Сойму 10-га чэрвеня беларускія і украінскія паслы, ў знак пратэсту проці варожае да „мешасьцяў" палітыкі ўраду п. Грабскага, у працягу 15 мінут крыкамі і стукам не давалі п. Грабскаму распачаць сваё экспозэ.

Бунт палітычных вязьняў.

Ня гледзячы на заявы п. Тугута і ўсіх польскіх ура-патрыотаў, быццам у вастрогах Польшчы пануе для палітычных вязьняў „рай", у люблінскім вастрозе (ў замку) узьняўся бунт палітычных вязьняў, якія зьнішчылі ўсю абстаноўку камер. Улада „энэргічна" затушыла выбух бунту, ня даўшы яму пашырыцца. Учасьнікі бунту будуць вывезены ў вастрог у Сьвята-Крыжскіх Гарах.

Вышэйазначаныя цэрквы (касьцёлы) і рэлігійныя таварыствы маюць права, ў межах унутранага заканадаўства, карыстацца і набываць рухомую і нярухомую маемасьць, неабходную дзеля выпаўненьня рэлігійных абрадаў, а таксама ўтрыманьня духавенства і царкоўных (касьцельных) інстытуцыяў.

На тых самых асновах яны маюць права карыстаньня цэрквамі (касьцёламі) і інстытуцыямі, неабходнымі дзеля выпаўненьня рэлігійных абрадаў.

Гэтымі самымі правамі карыстаюцца асобы беларускае, расейскае і ўкраінскае нацыянальнасьці ў Польшчы.

У-ва ўсей гэтай дыпляматычнай перапісцы, якую мы тут падалі, зварачае на сябе асаблівую ўвагу тое, што мы падчыркнулі ў канцавым вывадзе ноты Чычэрына: саюзны ўрад, лічучы, што польскі ўрад уважае патрэбным выпаўняць *ня ўсе* артыкулы рыжскага трактату, *„прыймае гэтае да ведама"*. Вось-жа ў гэтых славах зьмяшчаецца вельмі красамоўны недасказ: яго трэба разумець, як пагрозу, што і *ўрад ССРР можа зьняць з сябе абавязак выпаўняць тыя свае забавязаньні, якія яму нявыгодны*. Што гэта так, аб гэтым пасрэдна сьведчыць апошняя польская нота, якая асаблівы націск кладзе на *абавязковасьці выпаўненьня „ўсіх пастановаў рыжскага трактату"*.

Лаўрыновіч.

Спыненьне румынскага транзіту праз Польшчу.

„Kur. Polski" паведамляе, што румынскі вываз, які йшчэ нядаўна йшоў у Сярэднюю Эўропу праз Польшчу, цяпер зьмяніў дарогу і кіруецца або марской дарогай праз Галяц, або чыгункамі праз Будапэшт і Вену. Як румынскае збожжа, так і мука, скаціна і касьцяная мука вывозяцца новай дарогай, пераважна абмінаючы Польшчу.

Для польскіх чыгунак гэта цяжкая страта. Каб ацаніць вeліч яе, даволі адзначыць, што аднэй толькі касьцяной мукі праходзіла з Румыніі праз Польшчу каля 2.000 вагонаў. Аднэй з прычын гэтага зьяўляецца даражыня правозу праз Польшчу: праз Чэхію вязьці шмат таньней.

„Санацыя" скарбу і тут, як у-ва ўсіх іншых галінах эканамічнага жыцьця, абходзіцца Польшчы вельмі дарага...

Новы прадстаўнік Францыі ў Лізе Народаў.

На найбліжэйшай сэсіі Рады Лігі Народаў Францыю будзе рэпрэзэнтаваць ужо не п. Ганото, прыяцель Пуанкарэ, але, як даўней, пры Брыяне, Лявон Буржуа. Як кажа „Kur. Polski", гэты „прыяцель п. Эрыо" гатуецца да кіраваньня працай Рады Лігі, як яе старшыня, а адначасна і старшыня тэй „Камісіі Трох", якая разглядае скаргі ў справах нацыянальных меншасьцяў—дзеля дакладу іх Радзе... Вось цяпер „найвышшы час" пану Маршалку Сэнату, Тромпчыньскаму, высунуць для аканчальнай рэалізацыі свой шляхотны праект аб скасаваньні Трактату аб Меншасьцях...

Палітычнае палажэньне ў Нямеччыне.

Як мы і прадбачылі па складу новага парлямэнту, кіруючая „большасьць" у ім асталася тая самая, што была ў старым. А толькі што прэзыдэнт Эбэрт назначыў канцлерам (прэм'ерам) таго самага Маркса, зацьвярдзіўшы і ўвесь стары склад яго габінэту.

5 чэрвеня гэты „новы" ўрад прадставіўся новаму Сойму.

Праграма габінэту, абвешчаная ў экспозэ прэм'ера Маркса, кажа аб тым, што за прыняцьце і лаяльнае выкананьне дакладу камісій рэчазнаўцаў (у справе адшкадаваньняў) урад будзе дамагацца:

1) звальненьня ўсіх арыштаваных акупацыйнымі ўладамі немцаў, 2) скасаваньня ўсіх „свабодных" дагавораў, зробленых тымі ўладамі з нямецкімі прамысло̆ўцамі, 3) аддачы назад пад агульна нямецкае ўпраўленьне ўсіх захопленых акупантамі жалезных дарог, 4) скасаваньня мытнае граніцы паміж Нямеччынай і акупаванымі абшарамі і 5) эвакуацыі Рурскага басэйну і іншых абшараў у часе, прадбачаным у Вэрсальскім Трактаце...

Як бачым, праграма вельмі скромная і—таксама ня новая, як урад, што яе выставіў; абодва стаяць на груньце Вэрсальскага Трактату. На груньце такой праграмы няцяжка будзе паразуменьне з урадамі Францыі і Англіі.—Бо, як ведама, ангельскі ўрад мае ў сваім складзе міністраў, якія стаяць нават на груньце радыкальнага перагляду ўсяго Вэрсальскага Трактату...

У сваей адозьве, тлумачучы сарваньне перагавораў аб утвараньні праваацэнтравага ўраду, нацыяналісты заяўляюць, што прычынай гэтага было нездаваленьне іх дамаганьня перамены заграрічнай палітыкі, прарочучы хутка новы крызыс габінэту... Слушнасьць гэтага прароцтва ясна з таго, што на першым-жа паседжаньні парлямэнту выявілася, што ўрад мае зусім пэўную апору толькі ў 138 паслах з агульнай лічбы 470.

Людоўцы думкамі падзяліліся ўжо паміж правіцай і цэнтрам, але не разьдзяліліся яшчэ пакуль што на дзьве асобныя партыі, і дзеля гэтага вонкаў ня маюць выразнага твару і вольнай рукі...

Вельмі характэрная чырта палітычнага палажэньня ў Нямеччыне — тая, што Вэрсальскі Трактат, як нейкая сталёвая рашотка, адначасна і бароніць штучна трымаючыся ўрад слабога цэнтру, і рэвалюцыянізуе ўсё мацнеючыя з кожным днём у Сойме і ў Краі — абодва фланкі.

Справа аб шпігоўства.

Вярхоўны суд ССРР зацьвярдзіў прыгавор адэскага губсуда, якім засуджаны на сьмерць цэцера ўчасьнікаў арганізацыі, якая працавала ў Адэсе, шпігуючы на карысьць Польшчы і ўдягіваючы ў свае рады служачых у чырвонай арміі.

Новае Палітбюро Р. К. П.

Нававыбраны Цэнтральны Камітэт Р. К. П. выбраў Палітычнае Бюро ў гэткім складзе: Бухарын, Каменев, Зиновьев, Рыков, Сталін, Томскій, Троцкій. Кандыдаты: Молотов, Калінін, Рудзутак, Дзержыньскі, Сокольнікоў, Фрунзэ.

Вываз хлеба з ССРР.

Ад восені 1923 г. да 31 мая 1924 году продана заграніцу 170 міліонаў пудоў рознага збожжа.

Увазе пчаляроў!

21-га чэрвеня г. г. ў Кальварыі Ерузалімскай, каля Вільні, ў пасецы К. Шалькевіча пачнуцца 8-днёвыя пчалярскія курсы, даступныя для кожнага, бо плата ўсяго 3 злоты. Абоймуць яны ўсеньку гаспадарку ў вульлі амэрыканскім з надстаўкамі (Дадана), выраб вузы, г. зн. штучных плястраў, і гадоўлю мядадайных расьлінаў.

— Пасека Шалькевіча вартая агляду. Лад, парадак і вялікая любоў да свайго дзела кідаюцца ў вочы на кожным кроку; а курсы нашым дамарослым пчаляром могуць прынясьці вялікую карысьць і паказаць на практыцы, якую перавагу маюць вульлі амэрыканскія з надстаўкамі над ўсялякімі: Лявіцкага, варшаўскімі і т. д. а тымбольш над калодамі „стаякамі" і „ляжакамі", каторыя ўжо сьмела маглі-б заняць месца ў музэях старажытнасьцяў.

З. Верас.

Крах Польска-Беларускага Т-ва.

Да Пана Адваката В. Абрамовіча ў Вільні.

Паважаны Пане.

З даручэньня сваіх калегаў і знаёмых, у справе арганізацыйнага сходу Польска-Беларускага Т-ва, гэтым маю гонар паведаміць Вас, што трываючая дагэтуль палітычная вайна недае магчымасьці прымаць удзел у Т-ве нат тым з беларусаў, каторыя яшчэ так нядаўна выказалі сваё шчырае жаданьне знайсьці нейкі спосаб дзеля аслабленьня і злагоджаньня таго жудаснага зьдзеку, які так плянова і няўпынна праводзіць Польская Ўлада адносна Беларускага грамадзянства.

Ад пачатку нашых заходаў для зьбліжэньня абодвух народаў, баларусы ня бачаць зьмены ў адносінах да іх ня толькі Польскае Ўлады, а нат' Польскага грамадзянства.

Так напрыклад: узамен таго, каб заспакоіць нашы бязумоўна слушныя і неабходныя для нас прынамсі мінімальныя дамаганьні палепшаньня становішча нашых школаў, што абаснавана нашым, як спрадвечных грамадзян краю, правам і воляй народу, Урадовая Школьная Ўлада „прыхіляецца" даць, як нейкую ласку, нашай Віленскай Беларускай Гімназіі матуральную Камісію ў **польскай мове**, ігноруючы васьмігадовую падгатоўку вучняў пабеларуску, а Польскае грамадзянства ў асобе Віленскага Ваяводзкага К-ту „dla głodnych dzieci" „палепшыла" свае да нас адносіны, пазбавіўшы (ў красавіку і травені) галодных беларускіх дзяцей куска хлеба, належачага ім з гэтага К-ту.

У Вашых адносінах, Паважаныя Паны, бачым шчырае жаданьне аздаравіць гэтыя ненармальныя польска-беларускія адносіны, аднак жа апрача добрае волі і жаданьня ніякіх іншых спосабаў Вы ня маеце, тады—калі другая частка Вашага грамадзянства, рэакцыйна-шовіністычная, бадай адна ў сучасны момэнт маючая ўплыў на ход жыцьця ў нашым краі, як бачым, стараецца выкарыстаць перад Эўропай сам факт істнаваньня Польска-беларускага Т-ва і, муцячы апінію ўсяго сьвету, яшчэ больш пагаршае і да таго дрэннае нашае жыцьцё ў Польшчы.

Прыймаючы пад увагу ўсё вышэйшае, каб ня даць сябе выкарыстаць Вашым рэакцыянерам-шовіністам, мы лічым карысным для нашае супольнае справы ўстрымацца ад рэалізацыі нашых праектаў да часу палепшаньня агульна-палітычнага становішча ў Польшчы.

З шчырай пашанай **Радаслаў Астроўскі**
Дырэктар Віленскае Беларускае Гімназіі

Вільня, 29. V. 1924.

ХРОНІКА.

Дзеля вывазу натуральнага багацьця Заходняе Беларусі. Міністар чыгунак заявіў дэлегатам саюзу лясных прамыслоўцаў, што дзеля павялічэньня вывазу дрэва з Віленшчыны будзе зьменшана плата за правоз лясных матар'ялаў чыгункай. Гэтак прыпыніўшаяся рабункoвая гаспадарка ў нашых лясох ізноў пойдзе шыбчэй...

Арышты „камсамольцаў". „Dzien. Wil." паведамляе аб новых арыштах у Вільні. Арышты зроблены сярод моладзі, якую вінавацяць у прыналежнасьці да „камуністычнага саюзу моладзі". Сярод арыштаваных—дзьве студэнткі Віленскага Унівэрсытэту. Арыштаваны такжа нейкі Цукерман, вінавачаны ў прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняе Беларусі.

Адносіны чэхаў да Віленскага Унівэрсытэту. Студэнт віленскага унівэрсытэту Стафана Баторыя, мэдычнага факультэту, Францішк Пяткевіч, перабраўся ў Прагу, жадаючы паступіць на мэдыцыну ў тамтэйшы ўнівэрсытэт на аснове атрыманага ў Вільні пасьведчаньня—так-званага „паўдыплёму". Аднак, пасьведчаньне гэтае было прызнана чэхамі ня маючым вагі, раўназначным з пасьведчаньнямі радавых унівэрсытэтаў, непрызнаваных чэхамі.

Запытаньне пану Камісару Ураду ў Вільні. Пасьля таго, як у нашай газэце было надрукована аб крымінальнай прошласьці п. Валэйшы, „прэзэса" так-званага „Беларускага" Грамадзянскага Сабраньня і галавы „польскае партыі", апошні раздабыў сабе „рэзіну" і пачаў пагражаць ею ўсім, каго падазраваў у супрацоўніцтве ў газэце. Ды на грам. Луцкевіча спрабаваў напасьці, але напад быў адбіты гр. Луцкевічам яго ўласнай палкай з вельмі балючымі для Валэйшы вынікамі. Тады п. Валэйша завёў сабе рэвальвэр і пры сьведках далей грозіўся ўжыць яго проці беларускіх дзеячоў замест аказаўшаеся безкарыснай „рэзіны". Цяпер мы даведаліся, быццам п. Валэйша атрымаў ад прыналежнае ўлады права на нашэньне рэвальвэру. Дык пытаемся ў п. Камісара Ураду: ці гэта праўда і ці вядомы яму мэты, дзеля якіх п. Валэйшы прыпатрэбілася аружжа і права на нашэньне яго?

Літоўскі культурны юбілей. 8-га чэрвеня літоўскае грамадзянства сьвяткавала двадцатыя ўгодкі адваяваньня літоўскае прэсы. На жаль, для віленскіх літвіноў гэта зышлося з цяжкім ударам: польская ўлада загадала аднаму з найбольш чынных літоўскіх дзеячоў у Вільні, доктару Альсэйку, да 1-га ліпня зьліквідаваць усе свае справы, выбраць заграрічны пашпарт (ведама, за грошы!) і выехаць за межы Польскае Рэспублікі з усей сям'ёй. Калі-б ён ня выехаў самахоць, дык яго прымусова вывязуць у Літву.

Вітаючы праз [illegible]

прычыны яе двадцацілетняга юбілею, шлем адначасна віленскаму літоўскаму грамадзянству, утрацішаму энэргічнага свайго працаўніка, словы шчырага спогаду.

Весткі з вёскі.

Напады.

Сьвянцяны. У начы з 29-га на 30-га траўня банда, аружная вінтоўкамі і рэвальвэрамі, напала на засьценак Лютарышкі, уласнасьць Юрыя Марцінканца. Банда зрабавала 500 даляраў і залаты гадзіньнік. Ніхто ня злоўлены.

Кобрынь. У Кобрынскім павеце паліцыі ўдалося асачыць вядомую тут банду Амяльяніка. Пачалася фармальная бітва. У часе перастрэлкі куля папала Амяльяніку у грудзі, і ён быў забіты на месцы.

Алькенікі. 5-га чэрвеня пяцера бандытаў у вайсковых вопратках і з вымазанымі сажай тварамі, азброеныя вайсковымі вінтоўкамі і рэвальвэрамі, абрабавалі ў дарозе пад Алькенікамі трох купцоў: Ізаака Каразіцкага, Хаіма і Міхеля Вапнэраў. У рукі бандытаў папала 150 даляраў, 300 мільёнаў марак і розныя цэнныя рэчы.

Бандыты бязкарна ўцяклі...

Лахва. 3-га чэрвеня на рэйках паміж Лахвай і Мікашэвічамі перад праходам скорага поезду была паложана зялезная паласа, каб вывярнуць поезд. Поезд, наехаўшы на прашкоду, спыніўся. Ахвяр людзьмі няма. Вінавайцы ня выкрыты.

Нясьвіж. Тутака арыштавалі нейкага Аляксея Гошча, якога вінавацяць у кіраваньні дружынай партызанаў у Наваградчыне.

Сялянскі прыгавор у Тэлеханах.

Сяляне вёскі Тэлеханы, Косаўскага павету, зрабілі гэткі прыгавор аб сваім несьцярпімым палажэньні (прыгавор надрукаваны ў польскай часопісі „Wyzwolenie Ludu"):

„Наш голас—голас прападаючых ад нэндзы, якая шырокай хваляй заліла нашы сялібы, — хай ня будзе голасам „гукаючага ў пустыні".

„Хай ведама будзе ўсенькай Рэчыпаспалітай, што мы гінем ад нястачы зямлі, работы, хлеба, гінем у варварскай цемнаце ад нястачы школаў, гінем ад нячуваных дзяржаўных падатковых цяжараў, а найболш ад нялюдзкага ўціску мясцовымі абшарнікамі і спэкулянтамі, якія напружылі усе свае сілы, каб высмактаць з нас апошнія нашыя сокі. У нас забіраюць нават тую дробязь, якую мы мелі ў расейскія часы; ня маем ужо ніякіх праваў на нашы сэрвітуты, забралі ў нас і ральлю, з якое мы карысталі ад 1870 году і за якую плацілі і гатовы плаціць далей трацігну штогодняга ўраджаю.

„І нямашака ліку падобных гвалтаў, і нямашака ратунку ад іх, бо і суды і паліцыя і розныя ўрады—усе стаяць за ворагаў нашых.

„Як быццам усё змовілася, каб нас зусім зруйнаваць і зьніштожыць. А ўсіх, хто пратэстуе проці ўсіх гэтых надужыцьцяў, арыштоўваюць, вінавацючы ў бальшавізьме, а пасьля нялюдзка катуюць на пастарунках, садзяць у вастрогі, або руйнуюць цяжкімі штрафамі. Ды часта падае на людзей закід бальшавізму з усімі вынікамі гэтага толькі за тое, што ты не пакланіўся ў час і не даволі нізка пану з двара, ці камэнданту дзяржаўнае паліцыі, ці тайнаму агенту.

„На ўсё гэта мы, жыхары, прырослыя да маткі-зямлі, клічам: Зямлю нам дайце і школу! Вон абшарнікаў і іх прыслужнікаў!

„Гэтага жадаем, як вольныя і раўнапраўныя грамадзяне Рэчыпаспалітай".

Прадстаўнікі жыхароў вёскі Тэлеханы:

Ф. Кавалевіч, З. Віктаровіч.

Жаданьне паляшукоў.

У Пінску на зьезьдзе дэлегатаў ад арганізацыяў „вызваленцаў" 5-га траўня паміж іншымі дамаганьнямі было выстаўлена дамаганьне выкладаньня мясцовых моваў у народных школах, але „бяз шкоды для польскае мовы, як дзяржаўнай".

На гэтым зьезьдзе быў і галава польскае „лявіцы", п. Тугут. Як відаць, „вызваленцы" маніца жаданьне беларускіх школ падмяніць дапушчэньнем выкладу ў польскіх школах беларускае мовы.

Але хто будзе яе выкладаць? Ці ня тыя самыя вучыцялі-галіцыяне, што пабеларуску — ані ў зуб?!

Эпізод „урадаваньня" павятовага старасты ў Саколцы.

У першым дзесяцілецьці панаваньня зьмёртвыхпаўстаўшай „дэмократычнай" Польшчы на нашых заходніх акраінах, у Сакольскім павеце Гарадзеншчыны, быў (ці ёсьць, ня ведаю) Богам-царом на павятова-старастоўскім пасадзе п. Эйсмонт. Пан Эйсмонт, сын Сакольскага павету, як удалося мне чуць, некалісь меў пратэнсію да імя Беларуса і датаго (ці пэўна, наведаю) быў сябрам адраджэнска-перадваеннага беларускага камітэту. Што гэта ўсё байкі, то ясна, як Божы дзень, бо польская прэса, памінаючы „czyny syna Ojczyzny" і выхваляючы „sгуdzielo" п. Эйсмонта, як ініцыятара развалу праваслаўнае царквы ў Новым-Двары, дакладала выраз „polak". Але не аб гэтым хачу я цяпер успомніць. Мне хочацца напісаць аб іншым „prawdziwie obywatelskim czynie" п. Эйсмонта ў Сакольскім павеце.

На захадзе Сакольскага павету знаходзіцца мястэчка Сухаволя. Гэта тое слаўнае места, за якое спрачаліся два стаўбы навукі: праф. Карскі даказваў беларускасьць Сухаволі, а праф. J. Baudouin de Courtenay цягнуў слаўны горад на бок Польшчы. Каб заспакоіць цікавасьць паважаных чытачоў, адступлюся крыху ад тэмы і абвешчу, што справу спрэчкі выйграў наш прафэсар Карскі: асабіста зьезьдзіўшы да спрэчнага мястэчка, у першых гадох XX сталецьця, ён даказаў сьвету адвечную і цяперашнюю беларускасьць Сухаволі.

Жыхар гэтага слаўнага мястэчка Сухаволі N хацеў на абшырным рынку мястэчка побач касьцёлу пабудаваць будынiну, у якой залажыў кнігарню. (Цяпер як чуваць, кнігарня служыць вялікай падмогай акалічным сялянам, якія замест цягацца за пяцьдзесят вярстоў да Горадні па кніжкі для дзяцей, без клопату маюць пад бокам кнігарню і, таксама, праз яе выпісваюць газэты). Каб дастаць ад павятовага старасты дазвол на пабудаваньне 10m² гмаху, трэба абавязкава „uchwały" рады мястачковай. Тут уся задача. Рада Сухавольскага магістрату (думаю, што ўсюды таксама) складаецца з 12-цёх асоб, з якіх 6 хрысьціянаў і 6 жыдоў. Жыды-ж ня могуць галасаваць, аб дазволе на паўстаньне торговай пляцоўкі ў руках хрысьціяніна, бо гэта—contra se, а да таго, цадык выганіць з сынагогі. (У Сухаволі жыды дужа набожныя). Радныя-ж хрысьціяне, ня гледзячы на пагрозы і выкляньньне ксяндза, згадзіліся на пабудаваньне кнігарні. (Сухавольскі ксёндз гандлюе рознымі сьвятымі рэчамі: крыжамі, ражанцамі, шкаплерамі рознага сорту і коляру, кніжкамі дзеля малітвы і іншымі штукамі, то баіўся, каб гэты жыхар не адабраў ад яго зарабатку, дзеля гэтага крычэў проціў будаваньня кнігарні). Нарэшці, найшоўся сярод жыдоў радны, якога цадык не пужаў і напрыкметна кінуў голас—за, так, што выйшла за 7 галасоў, проціў 5. Кнігарня будуецца. Пан Эйсмонт ніяк ня змог памесьціць ў сваей галаве паступку раднага жыда. Бедны ня мог разьвязаць, як гэта — жыд галасаваў за хрысьціяніна? Запрасіў раднага жыда да Саколкі і адтуль хацеў яго жыўцом ў неба пасланць.

„Panie, pan dokonał prawdziwie obywatelskiego czynu, pan godzien chwały. Pan jesteś prawdziwym polakiem". Рэцытаваў дрыжучы п. Эйсмонт раднаму-жыду.

* * *

Ад часу паяўленьня на аблічча зямлі, Сухаволя ня мела так здольнага і толеранцыйнага праўдзівага дэмтэльмэна-бурмістра, якім быў (можа і цяпер ёсьць) п. Х. На дзьверах магістрату гадзіны урадаваньня напісаны былі у дзьвюх мовах: польскай і жыдоўскай. Спадзяюся, што першы п. Х ў ваўсей Польшчы адважыўся на такі дужа пекны пастунак, бо жыды Сухавольскія (маю на думцы старых жыдоў) па польску, як гаворыцца, ані гу-гу. Шрыфт-жа жыдоўскі быў ім вялікай палёгкай у паняцьці магістрацкага парадку. Нажаль, трывала гэта нядоўга. Прыйшоў час візытацыі Сухавольскага магістрату праз п. Эйсмонта. Калі нага п. старасты ступіла на парог магістрату, а вочы трапілі на надпіс, дык веусь раптам загрымелі: „Co to jest? do cholery ciężkiej!", рукі-ж п. старасты дзёрлі на кусочкі паперыну з „wrogim państwu nadpisem".

„To był, prawdziwie obywatelski czyn p. starosty. Pan jesteś prawdziwym polakiem!"

Якую падзяку меў бурмістр, гэта ня нам ведаць.

Гуль.

З УСХОДНЯЕ БЕЛАРУСІ.

Менская краязнаўчая канфэрэнцыя.

30 сакавіка адбылася Менская краязнаўчая канфэрэнцыя, скліканая Цэнтральным Бюро Краязнаўства пры Інбелкультуе. Галоўнай мэтай канфэрэнцыі было— аб'яднаць усіх працаўнікоў, якія аддаюць свае сілы на ізучэньне свайго краю, прыцягнуць да гэтае працы асоб зацікаўленых, знайсьці шчыльную сувязь паміж істнуючымі краязнаўчымі арганізацыямі і Цэнтральным Бюро і супольнымі сіламі выпрацаваць той напрамак, у якім кіравацца для большага посьпеху ў наладжаньні працы.

Старшыня Бюро А. Смоліч зрабіў даклад аб заданьнях краязнаўчай працы і даў прыкладную схэму арганізацыі. Па яго думцы пры Ц. Бюро закладаецца „Навуковая кансультацыя", якая канчаткова апрацоўвала-б здабытыя на мейсцах матарыялы, а таксама давала-б указаньні, інструкцыі і пляны аб правідловай працы. Пад кіраўніцтвам Бюро знаходзяцца павятовыя краязнаўчыя таварыствы, якія закладаюць свае аддзяленьні ў валасьцёх і ў больш-менш падходзячых мяйсцох не-адміністрацыйнага характару. Сябры таварыстваў і аддзяленьняў непасрэдна вядуць зьбіральную і пасільную дасьледчую працу, вынікі якой напраўляюць у вышэйшыя ўстановы, альбо непасрэдна ў Бюро. Дзеля наладжаньня гэтай сеткі таварыстваў, дзеля яе ажыўленьня і інструаваньня вялікую ролю, па думцы дакладчыка, могуць адыграць студэнты і студэнцкія гурткі.

Канфэрэнцыя прызнала гэту схэму рацыянальна пастроенай і выказала пажаданьне, каб пры Бюро была арганізавана студэнцкая сэкцыя.

Вучоны сэкратар Бюро Скандракоў зрабіў даклад аб узаемаадносінах паміж школай і краязнаўчымі арганізацыямі.

Урэшце, рад сяброў зламжылі даклады інфармацыйнага характару:

Пр. Пічэта — пра крыніцы беларускай гісторыі, Харлапові́ч—пра палажэньне цэнтральнага музэю, Барашка—пра Цэнтрархіў.

Сьцяпуржынскі, як прыклад дасьледчай краязнаўчай працы, прачытаў свой твор: „Гісторыя Менску".

Агляд часопісей.

„Крывіч". № 1. Студзень — красавік 1924 г. Коўна.—Вялікі сшытак дае даволі многа гістарычнага матар'ялу—пераважна кампіляцыю з прац гісторыкаў у чужых мовах, якія зачапляюць мінуўшчыну Беларусі. Цікавы абразок, як „вышэйшая" польская культура ў Беларусі нішчыла агнём у часы каталіцкае рэакцыі старыя беларускія пісаныя і друкаваныя кнігі. Але найбольш цэнныя зьнімкі з старых слуцкіх і гарадзенскіх паясоў, калекцыю якіх „беларуская патрыётка" княгіня Магдалена Радзівіллова падаравала... літоўскаму музэю ў Коўні! Добра, што хоць з зьнімкаў з іх могуць карыстаць беларусы.

Звárачае на сябе ўвагу праца **праф. Т. Іваноўскага, Ластоўскага і К. Душэўскага** „Номэнклятура беларускіх птушак". Ацэнкай яе павінны заняцца спэцыялісты—знаўцы мовы і прыроды.

Матарыялы да беларускага адраджэнскага руху даюць: **К. Езавітаў** (Беларуская Вайсковая Цэнтральная Рада) і **Ян з пад Ласосны** (Гарадзенскі Беларускі Гуртох 1913 году—успаміны). З палітыкі адзначым: **В. Л—скі.** Новы падзел Беларусі, а такжа: Лісткі ў Карону Беларускага Мучаніцтва пад Польшчай.

Канчаецца сшытак сталымі аглядамі беларускага культурнага і грамадзкага жыцьця і „Кнігапісяй", якая, на жаль, не дае ніякое крытыкі цікавейшых прац у беларускай мове, а толькі іх пералічае.

Не на мейсцу ў паважнай часопісі „паэтыцкія" спробы В. Ластоўскага—ягоныя „ўзрыгі душы", вельмі далёкія ад паэзіі і груба-немузыкальныя.

„Перавясла". № 2. Студзень—красавік 1924 г. Часопісь беларускага паступовага студэнцтва. Прага.

Сымпатычнае ўражаньне робіць імкненьне нашае студэнцкае моладзі да распрацоўкі свaей ідэалёгіі, абасноўваючы яе на здабытых навуковых падставах. З гэтага пагляду зварачае на сябе ўвагу ў першы чарод стацыя **„Самакэта ці пабочнае зьявішча"**, падпісаная І. Д—н, якая нацыянальнае беларускае адраджэньне разглядае з пункту гледжаньня гістарычнага матэр'ялізму. Далей ідзе праца Т. Грыба: **„Аснаўныя падваліны вызвольнай ідэалёгіі беларускай нацыі"**, дзе аўтар даводзіць знаную, наагул, тэзу, што беларускі „вызвольны ідэал можа быць толькі працоўны ідэал", які Т. Грыб разумее, як сацыялістычны, хаця з гэтае працы нельга дагадацца, да якога імення кірунку сацыялістычнае мыслі належыць гэты прадстаўнік беларускіх эсэраў. Аддзел ідэалягічных стацей дапаўняюць палітычныя стацьці на бягучыя тэмы.

Паэтычная творчасьць нашых пражскіх студэнтаў прадстаўлена вершамі І. Д., В. Русака, Наля, Ул. Ж., Бялічанкі і радам дробных апавяданьняў Псэўданіма, Фрыца, У. Жылкі, Курыуса, Я, Пыла. Не ўваходзячы ў падробную ацэнку іх, адзначым, як агульную рысу, непадробленую шчырасьць перажываньняў аўтараў і даволі добрае апанаваньне формы. На жаль, з боку мовы можна зрабіць паважныя закіды: сустракаюцца такія калечаньні мовы (асабліва ў стацьці І. Д—на), якія яйшчэ могуць быць цярпімы ў штодзеннай газэце, але не ў трох-месячніку, дзе ёсьць даволі часу на карэктуру!

Сшытак заканчывае хроніка пражскага беларускага жыцьця.

Н.

Сельска-гаспадарскія парады.

Як уберагчы рассаду ад мошкі.

Капуснай мошкай сяляне называюць зазвычай маленькіх чорных або рабых жучкоў, велічынёю крыху большых за блыху, якія, як і блыха, ня бегаюць, а скікаюць (гэта капусная мошка завецца яшчэ земляной блыхой). Гэта мошка аб'ядае маладыя расьлінкі капусты, рэпы, рэдзькі і грыжыны (бручкі). Часта мошка зусім аб'ядае гэтыя расьліны і нішчыць гэткім парадкам усю рассаду. Мошка зьяўляецца толькі пад канец вясны (ў траўні месяцы); у пачатку лета яна ўжо зьнікае ізмоў да вясны.

Для абароны ад мошкі, расьліны абсыпаюць раніцаю (пакуль расьліны мокрыя ад расы) попелам. Трэба старацца, каб попел прыліпаў зысподу да лісьцяў расьлінак. Калі адзін попел не адбівае мошку, дык трэба яшчэ адзін або два разы абсыпаць расьліны попелам з табакай, што да нюханьня. На вядро прасеянага попелу трэба браць чверць фунта нюхацельнай табакі.

Мошка аб'ядае лісьцё толькі тады, як ужо падымаецца і прыгрэець сонца, дзеля гэтага, каб уберагчы рассаду ад мошкі, паліваюць рассаду сьцюдзёнай вадой, як ужо падымаецца сонца. Ад сьцюдзёнай вады мошка ўцякаець.

Каб зусім недапусьціць мошку ў рассаднік, рассаднікі робяць высока ад зямлі на слупох. На ўваганьня ў зямлю слупы кладзецца памост, на які насоіцца зямля і сеецца рассада.

Я. П.

Рэдактар-Выдавец **М. Шыла.** Друкарня Левін і Сын. Вільня, Няметская 22.